Пятніца, 18 Верасень 2020

20 базавых за «Jabat'ka Hotel…» ды іншыя прысуды 18 верасьня па справах мірных пратэстоўцаў

Друкаваць (/news/sud/item/3746-20-bazavykh-za-jabat-ka-hotel?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=e855ff80c7f80b03d473072792d0b3f7a7533fa2)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/fedf822a25b5591e2b0cb820e380b880_XL.jpg)

Кацярына Макарэвіч

12 верасьня ў Кастрычніцкім і Першамайскім судах Віцебску праходзілі адміністрацыйныя працэсы над удзельнікамі мірных акцый па артыкуле 23.34. Грамадзяне атрымалі штрафы ад 2 да 20 базавых велічынь. Найбольшы штраф прысудзілі аўтарцы плякату «Jabat'ka Hotel…».

Згодна пратаколу, агучаным судзьдзём **Міхаілам Юрчанкам** у судзе Першамайскага раёну, супраць віцяблянкі **Кацярыны Макарэвіч** па ч. 1, арт 23.34 былі выстаўленыя стандартныя абвінавачаньні: *«узяла актыўны ўдзел у несанкцыянаваным вулічным*

шэсьці без адпаведнага дазволу…».

Кацярына Макарэвіч не адмаўлялася ад свайго ўдзелу ў вулічным маршы 6 верасьня, больш за тое – яна адкрыта патлумачыла, чаму выходзіла на шэсьце.

> *«Я супраць гвалту, супраць фальсыфікацыі выбараў. Я разумела, што раблю, хаця лічу, што не павінна быць законаў, якія абмяжоўваюць негвалтоўнае выказваньне грамадзянскай пазыцыі. Я не магу быць убаку, калі людзей зьбіваюць, гвалтуюць – гэта ненармальна. Мае знаёмыя, сябры моцна пацярпелі ў пэрыяд ад 9 па 11 жніўня. І ні па адным выпадку ня ўзбуджана ніводнай крымінальнай справы, ніводзін з тых, хто ўчыніў гвалт, не пакараны»*, – выказалася Кацярына.

Судзьдзя Міхаіл Юрчанка аштрафаваў дзяўчыну на **2 базавыя велічыні** (54 рублі).

Рашэньне па справе **Мікіты Палеонка** прымала **судзьдзя Вераніка Барысава**. Зь меркаваньня міліцыі, маладзён парушыў усталяваны парадак правядзеньня вулічнага шэсьця. Адміністрацыйнае правапарушэньне было кваліфікаванае згодна ч.1, арт. 23. 34.

> Мікіта Палеонак патлумачыў, што ў вулічным шэсьці ён ня ўдзельнічаў, а ішоў побач. Звычайна адлегласьць складала 5-7 мэтраў, але на адным зь відэа, прадэманстраваным у судзе, ён амаль зьліўся з калёнай. Гэтая акалічнасьць, відаць, дала судзьдзі Барысавай падставу прызнаць правапарушэньне даказаным і аштрафаваць Мікіту на **2 базавыя велічыні** (54 рублі).

Разгляд справы **Канстанціна Бадэ**, які выйшаў з плякатам «Праўда пераможа сілу і хлусьню» не адбыўся. Судзьдзя Міхаіл Юрчанка адправіў яе на дапрацоўку.

У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску выкладчыца фартэпіяна **Тацяна Лук'янава** за выхад з плякатам «Jabat'ka Hotel...» пакараная штрафам у памеры 20 базавых велічынь (540 рублёў).

С. Горкі

Апублікавана ў Суд (/news/sud) , Мірныя сходы (/news/mirnyja-skhody)

Тэгі: артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « «Бачыў, што адбывалася ў ізалятары». Лекара хуткай дапамогі аштрафавалі за ўдзел у акцыі пратэсту (/news/sud/item/3744-bachyu-shto-adbyvalasya-u-izalyatary) Суды за мірныя маршы: Каваленка – 10 базавых, Кулакову – 7, Яскевіч – папярэджаньне » (/news/sud/item/3748-sudy-za-mirnyya-marshy)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3746-20-bazavykh-za-jabat-ka-hotel#startOfPageId3746)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https://t.me/Tamilwebseries)